нагрузку, а "інфармацыя" – выконвае ўдакладняючую функцыю. Адсюль вынікае, што інфармацыйная культура спецыяліста – гэта тая частка яго агульнай культуры, якая мае дачыненне да інфармацыі і звязана з уменнем яе стварэння, эфектыўнага пошуку, успрымання, апрацоўкі і выкарыстання. Можна сказаць, што інфармацыйная культура спецыяліста ўяўляе сабой інфармацыйны светапогляд і спосаб жыццядзейнасці спецыяліста ў інфармацыйным грамадстве, а таксама веды, уменні і навыкі аперыравання інфармацыяй, што ў сукупнасці садзейнічае развіццю прафесійнай дзейнасці, прафесійнаму станаўленню і ўдасканальванню.

Нягледзячы на існаванне разнастайных поглядаў на асобныя бакі інфармацыйнай культуры спецыялістаў, можна прасачыць дзве пазіцыі сярод большасці пунктаў гледжання. Так, пры аналізе інфармацыйнай культуры спецыяліста даследуюцца, па-першае, веды, якімі ён павінен валодаць, па -другое, якасныя характарыстыкі асобы. Неабходна заўважыць, што канкрэтная прафесійная дзейнасць прад'яўляе пэўныя патрабаванні да зместу інфармацыйнай культуры спецыялістаў, да ведаў, уменняў, навыкаў і асабістых якасцей, неабходных ім.

Інфармацыйная культура праяўляецца праз інфармацыйныя паводзіны асобы, пад якімі звычайна разумеюць стварэнне, улік, распаўсюджванне і набыццё інфармацыі, а таксама яе выкарыстанне і рэакцыю людзей на спажытую інфармацыю [2, с. 60; 3, с. 132]. Аналіз паводзінаў чалавека ў інфармацыйнай прасторы дазваляе выявіць наступныя элементы гэтага працэсу: 1) усведамленне патрэбы ў інфармацыі і фармуляванне інфармацыйнай мэты; 2) пошук неабходных інфармацыйных рэсурсаў; 3) ацэнка дакладнасці набытай інфармацыі; 4) выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў [4, с. 28].

Калі браць пад увагу элементы інфармацыйных паводзін асобы, можна вылучыць такія кампаненты інфармацыйнай культуры спецыялістаў, як крытычнае асэнсаванне ўласнай інфармаванасці па пэўнай праблеме, наяўнасць унутранай патрэбы ў пошуку дадатковай інфармацыі, уменне адэкватна фармуляваць сваю інфармацыйную зацікаўленасць; арыентацыя ў інфармацыйных рэсурсах, эфектыўнае ажыццяўленне пошуку неабходных ведаў ў розных інфармацыйна-пошукавых сістэмах; наяўнасць навыкаў успрымання, апрацоўкі і пераўтварэння інфармацыі; яе выкарыстанне ў практычнай дзейнасці і ўменне прымяняць творчае рашэнне ва ўмовах узнікнення праблемнай сітуацыі.

Інфармацыйная культура спецыялістаў характарызуецца даволі складанай структурай, якая ўключае розныя элементы. Так, можна вылучыць такія яе аспекты, як светапоглядны (уключае ўсведамленне сутнасці з'яў, законаў і заканамернасцей распаўсюджвання інфармацыі ў грамадстве, асэнсоўванне яе ролі ў кантэксце культуры), маральны (перашкаджае сацыяльна-дэструктыўным мэтам вытворчасці і выкарыстання інфармацыі), інфармацыйна-прававы (рэгулюе інфармацыйна-прававую дзейнасць спецыяліста), бібліяграфічны (падразумявае рэгуляванне, арганізацыю і ўпарадкаванне інфармацыі аб дакументах, якія далучаюцца да інфармацыйнага поля суб'екта), псіхалагічны (прадугледжвае выпрацоўку аптымальнай рэакцыі на новую інфармацыю, фармаванне ўменняў дзейнічаць ва ўмовах яе дэфіцыту і празмернасці), камунікатыўны (увасабляе культуру перадачы інфармацыі), лексічны (садзейнічае ўдасканальванню мовы пісьма, разуменню і выкарыстанню аўтарскага тэксту), інтэлектуальны (спрыяе ажыццяўленню навуковых даследаванняў, выпрацоўцы ўменняў працаваць з крыніцамі інфармацыі і афармляць атрыманыя вынікі), інфармацыйна-тэхналагічны (садзейнічае выкарыстанню сучасных інфармацыйных тэхналогій) і г. д. Усе гэтыя кампаненты інфармацыйнай культуры ўзаемазвязаны паміж сабой і павінны складаць у сукупнасці адно цэлае.

Такім чынам, інфармацыйная культура спецыялістаў уяўляе сабой даволі складаную з'яву. Яна ўключае не толькі тэарэтычныя веды і практычныя навыкі і ўменні аперыравання інфармацыяй, але і інфармацыйны светапогляд, які садзейнічае ўсведамленню спецыялістам свайго месца і ролі ў інфармацыйным грамадстве.

Багацце інфармацыйнай культуры спецыяліста з'яўляецца паказчыкам інтэлектуальных уменняў, эмацыянальнага стану і валявых намаганняў асобы. І чым вышэй яе ўзровень, тым больш гарантый правільнасці рашэнняў, якія прымае спецыяліст. Высокі ўзровень інфармацыйнай культуры спецыялістаў садзейнічае рэалізацыі іх творчага патэнцыялу, росту прафесійнага майстэрства і ў значнай ступені вызначае поспех прафесійнай дзейнасці.

*Літаратура:*

1. Бойко О.О. Информационная культура как компонент инновационной профессиональной деятельности / О.О. Бойко, Л.Н. Хуторская // III Академические чтения "Образование и наука на рубеже XXI века: проблемы и перспективы развития": Тез. докл. – Мн., 1997. – С. 131 – 132.

2. Брежнева В.В. От изучения потребностей к комплексному исследованию информационного поведения специалистов / В.В.Брежнева, В.А.Минкина // Информатизация и проблемы гуманитарного образования: Междунар. науч. конф., Краснодар – Новороссийск, 14–15 сент. 1995 г.: Тез. докл. – Краснодар, 1995. – С. 59 – 61.

3. Гаврилова Н.В. Формирование информационного поведения личности: гуманитарные проблемы // Итоги XX века: Гуманизация образования – проблемы и перспективы: Междунар. науч.-метод. конф., Витебск, 19 – 20 мая 1998 г.: Сб. науч. докл. – Витебск, 1998. – Ч.2. – С. 128 – 132.

4. Каширина Е.В. Информационная культура личности // Библиотечное дело – 2000: Проблемы формирования открытого информац. о – ва: Пятая междунар. науч. конф., Москва, 25 – 26 апр. 2000 г.: Тез. докл.: В 2 ч. – М., 2000. – Ч. 1. – С. 27 – 28.

© В. У. Рогачова, 2003

## САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯК СРОДАК ЭМАЦЫЯНАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ

На мяжы апошніх стагоддзяў радыкальна змяняецца змест, дынаміка і механізмы сацыялізацыі чалавека. Гэта абумоўлена глыбокімі зрухамі, якія адбываюцца ў эканамічнай, сацыяльнай і культурнай сферах грамадства, якое знаходзіцца ў стадыі трансфармацыі. Складанасць сітуацыі, непрадказнасць яе развіцця аказвае значнае ўздзеянне на працэс станаўлення асобы, павялічвае трывожнасць, эмацыянальную напружаннасць не толькі дарослых, але і дзяцей, фармаванне асобы якіх адбываецца ў крызісным грамадстве. Таму вывучэнне адзначаных тэндэнцый у грамадскім жыцці і адэкватнае іх адлюстра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

